12. *Палікоўская, Т.І.* Культурна-асветніцкая дзейнасць езуітаў на беларускіх землях у апошняй трэці XVI – 20-я гг. XIX ст. (стан і праблемы айчыннай гістарыяграфіі другой паловы XIX – пачатку XXI ст.) : дыс. ... канд. гіст. навук: 07. 00. 09 / Т.І. Палікоўская. – Мінск, 2006. – 116 с.
13. *Арлоў, Ул.* Полацкія езуіты / Ул. Арлоў // Родник (Крыніца). – 1993. – № 2. – С. 7 – 11.
14. *Блінова, Т.* З гісторыі Слуцкай езуіцкай калегіі / Т. Блінова // Беларускі гістарычны часопіс. – 1996. – № 1. – С. 67 – 70.
15. *Сидорцов, В.Н.* Методология исторического исследования (механизм творчества историка) / В.Н. Сидорцов. – Минск: БГУ, 2000. – С. 233.
16. *Нарэйка, Т.І.* Рэсурсы Internet, прысвечаныя гісторыі культурна-асветніцкай дзейнасці езуітаў на Беларусі ў XVI–XIX стст. / Т.І. Нарэйка // Гісторыя: праблемы выкладання. – 2004. – № 2 (32). – С. 52 – 54.
17. *Палікоўская, Т.І.* Культурна-асветніцкая дзейнасць езуітаў на беларускіх землях у апошняй трэці XVI – 20-я гг. XIX ст. (стан і праблемы айчыннай гістарыяграфіі другой паловы XIX – пачатку XXI ст.) : аўтарэф. дыс. ... канд. гіст. навук : 07.00.09 / Т.І. Палікоўская; Бел. дзярж. ун-т. – Мінск, 2006. – 20 с.
18. *Палікоўская, Т.І.* Гістарыяграфія культурна-асветніцкай дзейнасці езуітаў на Беларусі / Т.І. Палікоўская // Беларускі гістарычны часопіс. – 2005. – № 10. – С. 20 – 23.

Summary

The main achievements of native scientific ideas in XX^tes – XXIst in the history of cultural and educational work of the Jesuits in Belarus are characterized in the article. Work of national scientists which represents the history of this topic is a subject of historiographical analysis. The author describes an attempt to investigate Internet resources in this area. The methodological fundamentals of national historiography, conceptual approaches and subject domination of the topic research are revealed.

Паступіў у рэдакцыю 17.06.2010 г.

УДК 947.6+947.7«15/16»

У.М. Кадзіра,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт, намеснік дэкана гістарычнага факультэта БДПУ;
А.С. Юдзінец,
студэнт II курса гістарычнага факультэта БДПУ

УЗМАЦНЕННЕ ФЕАДАЛЬНАГА ПРЫГНЁТУ Ў ГАРАДАХ БЕЛАРУСІ І УКРАІНЫ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XVI – ПЕРШАЙ ТРЭЦІ XVII ст.

Паглыбленне грамадскага падзелу працы ў другой палове XVI – першай трэці XVII ст. спрыяла з'яўленню ў Беларусі і Украіне новых гарадоў і гарадскіх селішчаў (мястэчкаў), развіццю старых гарадоў і росту гарадскога насельніцтва. У Беларусі ў гарадах і мястэчках пражывала ў даследуемы перыяд ад 350 да 370 тыс. чалавек (прыблізна 12 % ад усяго насельніцтва) [1]. Расла колькасць гарадскіх жыхароў і ва Украіне. Так, у г. Каневе за 1552–1622 гг. колькасць дамоў павялічылася амаль у 7 разоў (з 226 да 1644), у Чаркасах – у 4,5 раза (з 257 да 1120), у г. Кіеве – у 3,6 раза (з 487 да 1750), у мястэчку Котыльня – у 9 разоў (з 70 да 633), у мястэчку Васількоў – у 8 разоў (з 60 да 500), у мястэчку Лубны – больш чым у 6 разоў (з 153 да 882) [2]. З'явіліся новыя гарады: Барыспаль, Гадзяч, Гайсін, Крамянчуг, Канатоп, Міргарад, Стараканстанцінаў, Фастаў, Умань і інш. [3].

Пашырэнне рыначных сувязей і развіццё таварна-грашовых адносін прывялі да паглыблення спецыялізацыі гарадскога рамяства, да пераходу рамеснікаў ад працы на заказ да працы на рынак. У гарадах Беларусі налічвалася каля 200 прафесій рамеснікаў і каля 300 у гарадах Украіны.

Рамеснікі амаль усіх беларускіх і ўкраінскіх гарадоў аб'ядноўваліся ў цэхавыя саюзы, куды, як правіла, уваходзілі прадстаўнікі аднолькавых або падобных спецыяльнасцей. Радавыя члены цэхавых арганізацый, чаляднікі і вучні прыгняталіся цэхавымі вярхамі. Прыбытак рамеснікаў паступаў «у братэрскую кружку», якой распараджаліся старшыя майстры [4].

Частка гарадоў належала дзяржаве (т. зв. каралеўскія гарады). Яны з'яўляліся адміністрацыйнымі цэнтрамі і часцей за ўсё кіраваліся на аснове магдэбургскага права. Значная колькасць гарадоў Беларусі і Украіны належала феадалам, у тым ліку і царкве (як каталіцкай, так і праваслаўнай). Так, напрыклад, у пачатку XVII ст. у Кіеўскім ваяводстве з 206 гарадоў каралеўскіх было 46, прыватнаўласніцкіх – 150, царкоўных – 10; у Брацлаўскім ваяводстве са 117 гарадоў каралеўскіх было 6, прыватнаўласніцкіх – 111; у Падольскім ваяводстве з 37 гарадоў каралеўскіх налічвалася 7, прыватнаўласніцкіх – 28, царкоўных – 2. У цэлым ва Украіне звыш 80 % гарадоў складалі прыватную ўласнасць. Праўда, некаторыя прыватнаўласніцкія гарады карысталіся магдэбургскім правам. Асобныя магнаты валодалі шматлікімі гарадамі. Канцапольскому, напрыклад, толькі на Брацлаўшчыне належала 170 гарадоў і мястэчак, Астрожскаму – 80 [5]. У Беларусі таксама больш за палову гарадоў і мястэчак былі прыватнаўласніцкімі [6]. Гэтыя гарады садзейнічалі пашырэнню месніцтва і сепаратысцкіх імкненняў ула-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

дальнікаў, а не цэнтрысцкім намерам караля. Феадальнае валоданне гарадамі затарможвала іх эканамічнае развіццё. Асабліва перашкаджалі развіццю так званыя юрыдыкі – зямельныя ўладанні свецкіх і духоўных феадалаў на тэрыторыі каралеўскіх гарадоў, якія не падпарадкоўваліся гарадскім судам і адміністрацыі. Астатнія гараджане былі абаронены законам [7]. У юрыдыкі ўваходзілі часам цэлыя кварталы з рамеснікамі і гандлёвым насельніцтвам. Узнікалі яны на аснове прывілеяў, выдадзеных феадалам каралём. Уласнікі юрыдык бралі з пражываючых там рамеснікаў і гандляроў розныя зборы, прымушалі іх адбываць павіннасці.

Для павелічэння прыбыткаў феадалы сялілі ў гарадах сваіх прыгонных сялян, каб выкарыстоўваць іх працу ў рамястве і гандлі. Так, у адным з дакументаў 1586 г. гаварылася, што ў Мінску «князи, панове и земяне ... духовного и светского стану с давных часов набывшы пляцов, подданных своих там осадили, которые в месте мешкаючи, торгов, ремесла, гандлев и всяких пожитков местеских ... уживают» [8]. Рамеснікам, якія пражывалі ў гарадах і мястэчках, што належалі феадалам, і займалася яшчэ сельскай гаспадаркай, паншчына замянялася чыншам або грашовым падаткам паводле статусу гарадскога насельніцтва [9].

Акрамя рамяства ў гарадах і мястэчках развіваліся промыслы. Гэта былі млыны, гуты, рудні, бровары, вінакурні і цагляныя прадпрыемствы. Млыны і прадпрыемствы па вытворчасці цэглы часта належалі магістратам гарадоў, іншыя прадпрыемствы, як правіла, былі ўласнасцю феадалаў. Тыя і іншыя здаваліся ў арэнду. Арандатары ў даследуемы перыяд ужо карысталіся наёмнай працай.

Асабліва цяжкім быў гвалт з боку старост і ваявод, якія накладвалі на рамеснікаў бязмерныя «повинности и пошлины незвыклые», што выклікала пратэст насельніцтва гарадоў і мястэчак [10, с. 216]. Так, жыхары Полацка скардзіліся, што ваявода «многие ремесные люди ... моцно еси на себе забрал и на себе им кажет робити» [11]. З такой жа скаргай звярнуліся і жыхары Гродна, дзе стараста падпарадкаваў сабе «мяшчан і ўсіх рамеснікаў ... амаль палавіну горада» [1, с. 205].

Мяшчане Жытоміра 12 лютага 1622 г. таксама звярнуліся са скаргай на падстарасту і арандатара, якія абцяжарвалі іх павіннасцямі і перашкаджалі займацца гандлем сваіх вырабаў [12, с. 25 – 26].

Развіццё рамяства, промыслаў і гандлю вяло да паглыблення сацыяльнай дыферэнцыяцыі гарадскога насельніцтва. Жыхары гарадоў дзяліліся на гарадскую арыстакратыю – патрыцыят (багатыя купцы і частка рамесных майстроў і арандатараў), бюргерства – цэхавых майстроў і гандляроў сярэдняй катэгорыі (у яе ўваходзілі ўсе заможныя гараджане, але не належалі да гарадской арыстакратыі), беднату, якая папаўнялася за кошт вучняў, чаляднікаў і бедных мяшчан. За межамі гарадской абшчыны знаходзіліся наймітыі, прыслуга, работны люд, заняты на падзённай працы, жабракі і валацугі. Яны складалі самую бяздольную і бяспраўную частку гарадскога насельніцтва – плебс. Плебей не валодаў правамі гараджаніна, таму на яго не распаўсюджваліся саслоўныя правы і прывілеі, хоць гарадская адміністрацыя прымушала бяздольных выконваць розныя павіннасці і плацяжы, а таксама пагражала арыштам або высяленнем з горада.

Асаблівасцю Украіны было тое, што частку гарадскога насельніцтва складалі казакі. Паводле люстрацыі 1616 г., у Каневе, Чаркасах, Чыгірыне, Карсуні, Белай Царкве, Пераяславе, Багуславе, Ірклееве, Сцеблеве, Голтве, Крапіўні, Данілаве, Баровіцы колькасць «непаслухмяных» (казацкіх) двароў складала ад 50 да 80 % (з гадамі іх колькасць павялічвалася). Так, з матэрыялаў рэвізіі Кіеўскага і Брацлаўскага ваяводстваў 1632 г. відаць, што ў Чаркасах, Ірклееве, Ягоціне, Крылове, Крапіўні, Бабровіцы такія двары складалі ўжо каля 82,3 % ад іх агульнай колькасці. Колькасць казакоў-гараджан асабліва прыкметна павялічылася падчас сялянска-казацкіх паўстанняў канца XVI – першай трэці XVII ст. [2, с. 284–285].

У некаторых «гарадах і мястэчках, – паказвалася ў каралеўскай інструкцыі для сеймікаў 1625 г., – усё кіраванне, уся ўлада ў казакоў, яны прысвойваюць юрысдыкцыю, усталёўваюць свае законы» [13]. Станаўленне казацкага палітычнага аўтанамізму адбылося ў канцы XVI ст. У верасні 1592 г. гетман Войска Запарожскага Крыштаф Касінскі ў лісце польскаму каралю Жыгімонту III Вазе ўпершыню абгрунтаваў ідэю непадпарадкавання казацтва ўладзе старост і ваявод [14].

Са свайго боку шляхта, якая пражывала ў гарадах або мела там юрыдыкі, імкнулася ліквідаваць казацкія юрысдыкцыі ў гарадах і мястэчках, вызваліць гарадское насельніцтва ад улады атаманаў, палкоўнікаў і іншых старшынаў, забараніўшы мяшчанам і сялянам, якія жылі ў гарадах, падпарадкоўвацца казацкім законам, бо «...за короткий час вся Україна обернеться в козацтво ...» [15].

Гарадавыя казакі займаліся рамяством, промысламі і гандлем. Ім адводзілася значная роля ў грамадска-палітычным і сацыяльна-эканамічным жыцці гарадоў. Сацыяльныя канфлікты з удзелам казацтва адбываліся не толькі паміж казацтвам, з аднаго боку, і адміністрацыяй, магнатамі і шляхтай, з іншага, але і паміж заможнымі казацкімі вярхамі і асноўнай масай казац-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

тва – дробнымі рамеснікамі, землеўласнікамі, а таксама казацкай беднатой, перш за ўсё парабкамі.

Пярэстую карціну ўяўляла гарадское насельніцтва і па нацыянальным складзе. У гарадах Беларусі большасць гараджан былі беларусамі, аднак крыніцы ўтрымліваюць звесткі і аб іншых нацыянальнасцях: паляках, рускіх, украінцах, літоўцах, немцах. Значнай групай гарадскога насельніцтва на захадзе і ў цэнтральных раёнах Беларусі ў XVI ст. былі яўрэі і татары [1, с. 202]. Ва Украіне, акрамя ўкраінцаў, якія складалі большасць насельніцтва, у гарадах пражывалі таксама рускія, беларусы, палякі, малдаване, літоўцы, армяне, немцы, яўрэі, балгары, венгры, сербы, грэкі, туркі, татары і інш. [16].

Заможныя гараджане з некарэннага насельніцтва займаліся гандлем, арандавалі промыслы, сядзібы, зборам пошлін. Ніжэйшыя пласты некарэннага насельніцтва займаліся рамяством, працавалі на промыслах. Пасля Люблінскай уніі 1569 г., якая аб'яднала Польшчу і Вялікае Княства Літоўскае ў адзіную дзяржаву – Рэч Паспалітую, ва ўмовах польскай феадальнай экспансіі небеларускае і неўкраінскае (асабліва польскае) гарадское насельніцтва ўзрастала асабліва хутка. Пасля захопу шляхецкай Польшчай Падляшша, Валыні, Брацлаўшчыны і Кіеўшчыны ў заходнеўкраінскіх гарадах у першай трэці XVII ст. некарэннае насельніцтва складала ўжо каля 30 % гараджан. У цэлым ролю замежных вярхоў ва ўкраінскіх гарадах можна з упэўнасцю параўнаць з роляй, якую адыграла ў свой час нямецкае бюргерства ў польскіх гарадах. На гэтай падставе Ф. Энгельс пісаў: «...Немцы перашкаджалі стварэнню ... польскіх гарадоў з польскай буржуазіяй. Сваёй асаблівай мовай, сваёй адчужанасцю ад польскага насельніцтва, тысячай сваіх розных прывілеяў і гарадавых становішчаў яны абцяжарвалі ажыццяўленне цэнтралізацыі гэтага моцнага палітычнага сродку хуткага развіцця ўсёй краіны. Амаль у кожнага горада было сваё асаблівае права; больш таго, у гарадах са змешаным насельніцтвам існавала ... рознае права для немцаў, для палякаў і для габрэяў» [17]. Пацвярджэннем гэтай думкі з'яўляюцца скаргі гараджан на самаўпраўства некарэннай гарадской арыстакратыі. Так, у 1576 г. рамеснікі львоўскіх цэхаў пісалі ў сваёй скарзе каралю: «Адна ... сям'я кіруе горадам... Бурмістрам з'яўляецца Вольф Шольц, адзін сын яго трымае вярхоўную ўладу войтаўства, іншыя сыны ... з'яўляюцца лаўнікамі, зяці – райцамі (членамі рады. – *У.М., А.С.*)» [18]. Імкнучыся ўмацаваць сваё прывілеяванае становішча, патрыцыят, якія складаўся з іншаземцаў, падтрымліваў рэжым, што ўсталёўваўся шляхецкай Польшчай.

Узмацненне феадальнага прыгнёту ў гарадах Беларусі і Украіны адбываецца ў канцы XVI – першай трэці XVII ст. З павелічэннем колькасці юрыдык феадалаў у гарадах скарачалася і іх плацежаздольнасць. Так, калі ў канцы XVI ст. у Магілёве была толькі адна юрыдыка замка, пад якой знаходзіліся 42 дымы, то ў 40-я гг. XVII ст. іх было ўжо больш за 10. Пры выплаце падаткаў жыхары Магілёва змаглі аддаць у казну менш чым 60 % неабходнай сумы [19].

Тыя гараджане, якія працягвалі займацца земляробствам, плацілі чынш, прычым памер яго ўвесь час павялічваўся. Калі, напрыклад, у Калушы ў 1549 г. збіралі па 20 грошаў з дыму, то ў 1616 г. – ужо па 30. У мястэчку Падгароддзе за паўстагоддзя грашовая рэнта з лана ўзрасла з 24 да 68 грошаў, павялічылася амаль у 3 разы [18, с. 34]. З гараджан спаганяліся самыя разнастайныя падаткі. Люстрацыя Жытомірскага староства 1622 г. сведчыць, што насельніцтва Жытоміра па сваім гаспадарчым становішчы дзялілася на тры катэгорыі: гараджане першай катэгорыі плацілі чынш па 2 злотых з гаспадаркі, другой – па 1 злотым і 12 грошаў, трэцяй – па 1 злотым. Памер грашовага чыншу залежаў таксама ад прафесіі або роду заняткаў. У другой палове XVI ст., напрыклад, у Каломне краўцы плацілі ў год па 7 грошаў, бондары, кушняры, шорнікі, слесары, кавалі, печнікі – па 8, ганчары – па 15; у Стараканстанцінаве рамеснікі плацілі па 4 грошы, перакупнікі – па 7; у Залочаве рамеснікі плацілі па 8–10 грошаў; у Рагаціне пекары – па 33 грошы [2, с. 291].

Акрамя рэгулярных падаткаў (падымнага, чапавога, шосавага, пазямельнага) і пошлінных збораў горада абкладаліся паборамі на ўтрыманне войска, дэпутатаў сойма, на аплату каралеўскіх прывілеяў гораду, на судовыя цяжбы ў апеляцыйным каралеўскім судзе. Значнымі былі гандлёвыя і кірмашовыя пошліны. Так, калі ў першай палове XVI ст. гадавы прыбытак у казну Вялікага Княства Літоўскага складаў некалькі больш за 46 тыс. злотых (14575 кап.), то ў 1578–1579 гг. толькі гандлёвая пошліна з купецтва і гандлёвых мяшчан дала казне каля 29 тыс. кап. або 72 тыс. злотых [20]. Такія паборы, як калядкі і вясельная куніца, сталі таксама спаганяцца грашыма.

Апроч плацяжоў грашыма гараджане адбывалі значныя натуральныя павіннасці. Напрыклад, насельніцтва Межырава ў канцы XVI ст. штогод давала старасце ад кожнай гаспадаркі тры меры хлеба, пчаліную і свіную дзесяціну і ад абшчыны 10 валоў. Насельніцтва Каламын і Яблунова ў першай трэці XVII ст. давала свайму спадару павалоўшчыну, пчаліную дзесяціну, свіную і авечую дваццаціну. Да гэтага дадавалася «хлебная мера» – плата за прымусовае карыстанне панскімі млынамі, броварамі і саладоў-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

нямі. У Галічыне гэта даніна часта перавышала ўсе натуральныя павіннасці. Захоўвалася і стацыя – натуральная павіннасць, што спаганялася з насельніцтва для ўтрымання каралеўскага войска [21].

Насельніцтва прыватнаўласніцкіх гарадоў і асабліва мястэчак часта адбывала паншчыну ў полі, чысціла сажалкі, майстравала гаці і г. д. Так, жыхары Ашмян магнатаў Патоцкіх адбывалі ў пачатку XVII ст. трохдзённую паншчыну з цяглай сілай і двухдзённую пешую паншчыну і выконвалі розныя сезонныя работы [22]. Гараджане Будзанова ва Украіне адбывалі двухдзённую паншчыну з цяглай сілай з лана і двухдзённую пешую паншчыну з паўлана. Шматлікія былі і іншыя павіннасці. Так, насельніцтва Цярнопаля ў сярэдзіне XVI ст. адзін дзень у год ціснула хлеб, адзін дзень касіла сена; жыхары Слабодзішча ў канцы XVI ст. дзень аралі, дзень ціснулі, дзень касілі; насельніцтва Каменкі-Струмілавай у першай трэці XVII ст. два дні выходзіла на лоўлю рыбы сеткамі; у Аўручыне – адзін дзень касіла або жала; у Ліцвіне – два дні арала, два – касіла, два – жала. Колькасць адпрацоўваемых дзён пастаянна павялічвалася. Калі насельніцтва Хмельніка ў 1576 г. адпрацоўвала два дні паншчыны, то ў 1618 г. – ужо шэсць [2, с. 292].

Значным цяжарам на плечы гараджан клаліся павіннасці і работы, звязаныя з будынкам і рамонтам замкаў, іх аховай, утрыманнем гарнізонаў. Напрыклад, насельніцтва Жытоміра ў 1616 г. скардзілася люстратарам на нягоды, якія яно церпіць ад замкавай адміністрацыі. Жыхароў горада прымушалі вазіць дровы, з'яўляцца ў замак «на працы … з сякерамі штодня», хоць паводле прывілея яны павінны былі працаваць усяго шэсць дзён у год, ды і то толькі ўлетку [23].

На карысць духавенства з гараджан спаганялася царкоўная дзесяціна грашыма і розныя даніны. Так, у канцы XVI ст. насельніцтва Мікалаева (Галічына) аддавала святару з двара па паўмеркі жыта і аўса і, акрамя таго, на Вялікдзень – па грошы з двара (каморнікі – паўгроша) [24].

Уладальнікі гарадоў і мястэчак часта аддавалі гараджан у арэнду і заклад, што практычна азначала – на разрабаванне і спусташэнне арандатарам.

Вялікую бяду гарадам, у тым ліку і тым, якія карысталіся магдэбургскім правам, прыносілі самаўпраўства каралеўскай адміністрацыі, бясчынствы размешчаных у гарадах салдат, феадальныя міжусобіцы і шматлікія войны. Польскі пісьменнік і публіцыст Шымон Старавольскі самаўпраўнасць каралеўскай адміністрацыі лічыў «першым вялікім злом» для Рэчы Паспалітай XVI – XVII стст. [25]. Буржуазны гісторык А. Яблонаўскі, адзін з апалагетаў прасла-вутай «цывілізатарскай місіі» польскай шляхты ў Беларусі і Украіне, вымушаны быў прызнаць, што ўкраінскія і беларускія гарады і іх насельніцтва цярпелі ўціск з боку стараст і іншых службовых асоб каралеўскай адміністрацыі, неабмежаваная ўлада якіх пераважала над гарадамі. Аб самаўпраўстве прадстаўнікоў каралеўскай улады ў першай палове XVII ст. у «Летапісе Самавідца» гаворыцца: «…вимисли надуманные повинности и различные унижения велікие были от старостов» [26].

У канцы XVI ст. кіеўскія рамеснікі скардзіліся каралю на злоўжыванні ваяводы і іншых урадникаў: «Повинности и пошлины незвыклые на них вытягуют, до везенья (у турму. – *У.М., А.С.*) безвинне сажают и трудности задают» [27]. Улады прымушалі рамеснікаў дарма аддаваць ім свае вырабы, выконваць розныя цяжкія работы.

Шмат ліха прыносілі гарадам магнацкія міжусобіцы, нязменным спадарожнікам якіх былі рабаванні насельніцтва. Паны «спешили на грабежи, как [осы] на мед». Так, у верасні 1584 г. шляхціч М. Немірыч напаў на мястэчка Сякерышча, якое належала шляхцічу Т. Бутовічу, «з многими слугами и помочниками, и з иншею многою стрелбою и оружием… конно и збройно … кгвалтом … все побрал, попалил», а слугі Немірыча ў мястэчку «яко … татары побурили» [28].

Аб рабаванні Ш. Старавольскі з абурэннем пісаў: «Мала таго, што з хаты беднага гараджаніна … усё жаўнер забярэ, не пакіне і клямкі, але яшчэ і здзекуецца з беднага чалавекам, укручваючы пальцы ў цынгель стрэльбы, саджаючы босымі нагамі на вуглі, … што вочы на лоб лезуць, чаго над няшчаснымі людзьмі ні татарын, ні турак падчас нападу не рабіў» [29].

Такім чынам, у параўнанні з папярэднім часам, ускладнілася становішча беларускіх і ўкраінскіх гарадоў. Не гаворачы пра вузкі ўнутраны рынак, абумоўлены панаваннем у краіне феадальна-прыгоннай сістэмы, развіццё гарадоў стрымлівалася асаблівымі прывілеямі шляхты, якія падрывалі гарадское рамяство і гандаль. Вялізную шкоду гарадам наносіла таксама феадальная анархія, самаўпраўства каралеўскай адміністрацыі і дыскрымінацыйная нацыянальная палітыка: абмежаванне ўкраінскага і беларускага мяшчанства ў сферы гаспадарчай дзейнасці і ў правах на ўдзел у гарадскім самакіраванні, гвалтоўнае акаталічванне і апалячванне.

Літаратура і крыніцы

1. Гісторыя Беларускай ССР: у 5 т./ рэдкал.: І.М. Ігнаценка (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Навука і тэхніка, 1972–1975. – Т. 1. Першабытны лад на тэрыторыі Беларусі. Эпоха феадалізму / рэдкал.: К.І. Шабуня (гал. рэд.) [і інш.]. – 1972. – 487 с.
2. История Украинской ССР: в 10 т. / гл. ред.: Ю.Ю. Кондифор. – Киев: Наукова думка, 1982. – Т. 2. – С. 284–285.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

3. *Артюшевский, О.П.* Совместная антикрепостническая борьба трудящихся масс России, Украины и Белоруссии. Вторая половина XVI – 60-е годы XVII ст. / О.П. Артюшевский. – Киев: Вища школа, 1987. – С. 25.
4. Археографический сборник документов, относящихся к истории Северо-Западной Руси. – Вильно, 1867. – Т. 1. – С. 327.
5. Історія України в документах і матеріалах / отв. ред.: С.М. Белоусов.– Київ: Вид-во Акад. наук УРСР, 1941. – Т. 3. – С. 47.
6. *Грицкевич, А.П.* Частновладельческие города Белоруссии в XVI–XVIII вв. / А.П. Грицкевич. – Минск: Наука и техника, 1975. – 248 с.
7. Статут Вялікага княства Літоўскага 1566 года. – Мінск, 2003. – Раздз. 4. – Арт. 46, 47.
8. Гісторыя Беларускай ССР: у 5 т. / рэдкал.: І.М. Ігнаценка (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Навука і тэхніка, 1972–1975. – Т. 1: Першабытны лад на тэрыторыі Беларусі. Эпоха феадалізму / рэдкал.: К.І. Шабуня (гал. рэд.) [і інш.]. – 1972. – С. 201–202.
9. РИБ. – Юрьев, 1914. – Т. XXX. – Ст. 159.
10. Архив Юго-Западной России, издаваемый Комиссией для разбора древних актов, состоящей при Киевском, Подольском и Волынском генерал-губернаторе. – Киев, 1907. – Т. 5. Ч. 8. – 560 с.
11. Полоцк. Исторический очерк. – Минск, 1962. – С. 40.
12. Воссоединение Украины с Россией: документы и материалы. В 3 т. / редкол.: П.П. Гудзенко [и др.]; сост.: Е.М. Апанович, Е.И. Луговая, С.П. Майборода [и др.]. – М.: Изд-во Акад. наук СССР, 1953. – Т. 1. – 584 с.
13. Воссоединение Украины с Россией: документы и материалы. В 3 т. / редкол.: П.П. Гудзенко [и др.]; сост.: Е.М. Апанович, Е.И. Луговая, С.П. Майборода [и др.]. – М.: Изд-во Акад. наук СССР, 1953. – Т. 1. – С. 64.
14. *Брехуненко, В.* Дванадцять листів гетьманів Війська Запорозького XVI – першої половини XVII століття з польських рукописних зібрань / В. Брехуненко, М. Нагельский // Український археографічний щорічник. – Киев; Нью-Йорк, 2004. – Вип. 8/9. – Т. 11/12. – С. 440.
15. *Мицик, Ю.* Польський публіцистичний трактат першої чверті XVII століття про запорозьке козацтво / Ю. Мицик // Український археографічний щорічник. – Киев. – Т. 11/12. – С. 457.
16. Жерела до історії України–Руси. В 22 т. / гол. ред.: М. Грушевский. – Львів: Б.И., 1908. – Т. 8. – С. 143.
17. *Маркс, К.* Сочинения: в 30 т. / К. Маркс, Ф. Энгельс. – 2-е изд. – М.: Политиздат, 1959. – Т. 5. – С. 338.
18. *Михайлина, П.В.* Визвольна боротьба трудового населення міст України (1569–1654) / П.В. Михайлина. – Киев: Наукова думка, 1975. – С. 53.
19. НИАБ. – Фонд 517. – Оп. 1. – Д. 15. – Л. 569–671.
20. НИАБ. – Фонд 1275. – Оп. 1. – Д. 87. – Л. 244.
21. Центральный государственный архив древних актов (ЦГАДА). – Фонд 124. – Д. 18. Малороссийские дела.
22. AGAD: Archiwum Publicznego Potockich. – Dzial IV, publo 29.
23. *Баранович, А.И.* Украина накануне освободительной войны середины XVII века (социально-экономические предпосылки войны) / А.И. Баранович. – М.: Изд-во Акад. наук СССР, 1959. – С. 48.
24. Архив ЮЗР. – Киев, 1876. – Т. 1, ч. 6. – С. 263.
25. Starowolski, Szymon. Wybor z pism / Szymon Starowolski. – Wroclaw; Warszawa; Krak w, 1991. – S. 74.
26. Літопис Самовидця. – Київ, 1971. – С. 46.
27. Архив ЮЗР. – Киев, 1907. – Т. 5, ч. 8. – С. 216.
28. Архив ЮЗР. – Киев, 1876. – Т. 1, ч. 6. – С. 143–144.
29. Starowolski, Szymon. Wybor z pism / Szymon Starowolski. – Wroclaw; Warszawa; Krak w, 1991. – S. 107.

Summary

The authors in their article considered the specify of the towns' development in Belarus and in the Ukraine. A feudal land property and an unlimited power of feudals in the private towns leaded to the social conflicts and the anti-feudal fight of townsmen in Belarus and in the Ukraine. Authors showed that the combination of the Magdeburg's law with the standards of town's law, which turned off in ancient Russian towns, was typical for towns. In authors' opinion town's movements became a reason to the feudal conditions and had a local character.

Паступіў у рэдакцыю 05.03.2010 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

УДК 930.25:947.072.5

І.А. Груцо,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт славянскай гісторыі і метадалогіі гістарычнай навукі БДПУ

МАТЭРЫЯЛЫ РАСІЙСКІХ АРХІВАЎ ЯК КРЫНІЦЫ ПА ГІСТОРЫІ ВОІНСКІХ РЭЛІКВІЙ ФРАНЦУЗСКАГА ВОЙСКА Ў ВАЕННАЙ КАМПАНІІ 1812 г.

Да ліку найбольш вядомых кровапралітных канфліктаў паміж еўрапейскімі краінамі адносіцца Айчынная вайна 1812 г. Яе асобныя аспекты з'яўляюцца спрэчнымі і недастакова вывучанымі, у прыватнасці, лёс воінскіх рэліквій французскага войска, згубленых на тэрыторыі Беларусі падчас яго адступлення з Масквы. З дакументальных крыніц па дадзенай праблеме найбольшую каштоўнасць уяўляюць архіўныя матэрыялы. Яны прадстаўлены дакументамі французскага і рускага камандавання. Аналіз іх зместу дазваляе зрабіць шэраг важных і арыгінальных высноў не толькі па гісторыі ваеннай кампаніі 1812 г. у цэлым, але і аб лёсе знакаў воінскай доблесці французскага войска. Яны вядомы пад назвай «Арлы», дзякуючы свайму галоўнаму элементу – бронзавай пазалочанай скульптуры арла – дзяржаўнага знака напалеонаўскай Францыі, якая выкарыстоўвалася ў якасці навершнікаў для палкавых сцягоў.

Французскія дакументы з'яўляюцца трафеямі, адбітымі ў адыходзячага напалеонаўскага войска 14 лістапада пад Корытняй і 17 лістапада каля Краснага, усяго 115 спраў. Сярод іх ёсць сапраўдныя дэкрэты Напалеона I, у прыватнасці аб «Арлах» і сцягах узору 1811 г. [1,